**Т. В. ЛОЙША,**
настаўніца сярэдняй школы № 8 г. Гродна

# ЗАЙМАЛЬНЫ МАТЭРЫЯЛ ПА ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА для вучняў V—VI класаў

**Прапануем увазе настаўнікаў дыдактычны займальны матэрыял па творчасці Якуба Коласа. Сёлета адзначаецца 135 гадоў з дня нараджэння славутага класіка. Таму заданні будуць карыснымі не толькі на ўроках беларускай літаратуры, але і на пазакласных мерапрыемствах, прысвечаных гэтай знамянальнай даце.**

**Прапанаваны матэрыял дапаможа яшчэ раз узгадаць творы Якуба Коласа, якія вывучаліся на працягу навучальнага года, зрабіць працэс навучання больш цікавым і разнастайным.**

## V клас

У пятым класе вывучаюцца наступныя творы Якуба Коласа: казка «Крыніца», урывак «Песня ляснога жаваранка» з трылогіі «На ростанях», урыўкі «На рэчцы» і «Дарэктар» з паэмы «Новая зямля», апавяданне «У старых дубах». На аснове іх складзены наступныя заданні.

**1. Разгадайце наступныя рэбусы.**

1. А = Ы

 +  ‘

*(Крыніца.)*

2. У = Э



*(Рэчка.)*

3.



1323 *(Гара.)*

4. О = А

ЖА +  + К

*(Жаваранак.)*

5.

 , +  ,,,,,

*(Песня.)*

6.

Л + 

*(Лёд.)*

7.

 ,, + Я

*(Хвоя.)*

8. А = Ю

Л + 

*(Люстра.)*

9.



Л23Ь *(Лось.)*

10.

 +  ,

*(Колас.)*

**2. Разгадайце крыжаванку.**




1. **«Такая спакойная, нерухомая, як быццам зусім акамянела і застыла».**

2. **«Была такая скромная, такая сарамяжлівая, што нават не зварачала ўвагі на сябе самую і ніколечкі не ганарылася сабою».**

3. **«На скошаным лузе, недалёка ад дубоў, пасвіліся статкі. Там і сям сядзелі...»**

4. **«Асоўваўся і агаляў тоўстыя карані старога дуба».**

5. **Хатні настаўнік у дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы.**

6. **Вялікі ён, рагаты,**
**Паджары і стрынгаляваты.**

7. **«Надзвычай багатая, разнастайная, дзівосна прыгожая і такая чоткая, такая выразная, што яе можна палажыць на ноты».**

8. **«...Свае песні спявае ён у бязлюдных мясцінах, дзе рэдка бывае чалавек і мала хто чуе іх».**

9. **Добры той знаёмы,**
**Стаіць збялелы, нерухомы.**

**Адказы:** 1 — зямля; 2 — крынічка; 3 — пастушкі; 4 — бераг; 5 — дарэктар; 6 — лось; 7 — мелодыя; 8 — жаваранак; 9 — лес.

**3. Гульня «Перакладчыкі».** Да рускіх слоў падбярыце беларускія адпаведнікі.

Путешественник, луна, художник, звёзды, стая, волна, капельки, жизнь, бумага, аист.

**Адказы:** путешественник — падарожны; луна — месяц; художник — мастак; звёзды — зоркі; стая — чарада, зграя; волна — хваля; капельки — кропелькі; жизнь — жыццё; бумага — папера; аист — бусел.

**4. Гульня «Паштальёны».** Разнясіце пошту па хатках.

Снег, галава, гусі, вярба, мароз, дуб, салавейка, плечы, нос, бяроза, вецер, хвоя, жаваранак, іней, сэрца, бусел.




**Адказы:** *птушкі*: гусі, салавейка, жаваранак, бусел; *дрэвы*: вярба, дуб, бяроза, хвоя; *часткі цела*: галава, плечы, нос, сэрца; *з'явы прыроды*: снег, мароз, вецер, іней.

**5. Гульня «Расшыфроўшчыкі».** З дапамогай лікаў зашыфраваны сказ з апавядання «У старых дубах». Лікі адпавядаюць парадкаваму нумару літар у беларускім алфавіце, г. зн. кожны лік — гэта пэўная літара (ДЖ, ДЗ асобнымі літарамі не лічацца).

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 1 | 9 | 28 | 13 | 29 |

| |
|---|
| 10 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4 | 18 | 28 | 27 | 12 | 1 |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 15 | 1 | 11 | 13 | 6 | 17 | 27 | 28 | 32 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | 18 | 21 | 8 | 2 | 1 | 12 | 10 |

**Адказ.** Базыль і Грышка — найлепшыя дружбакі.

**6. Па малюнку назавіце твор, з якога ўзяты вобраз.**



Гара *(«Крыніца».)*



Хвоя *(«Песня ляснога жаваранка».)*



Сякерка *(«На рэчцы».)*



Лапці *(«Дарэктар».)*



Ражончык (ражон) — дубчык, востры кіёк. *(«У старых дубах».)*

**7. Злучыце аўтарскія параўнанні.**

| | |
|---|---|
| 1) крыж пахілы | А) як воблак кучаравы |
| 2) лес стаіць збялелы, нерухомы | Б) як дубіна |
| 3) хвоечкі малыя | В) як галіны |
| 4) маладзенькія ялінкі | Г) як сіраты якія |
| 5) рогі тыя | Д) як добры той знаёмы |
| 6) праменні | Е) бы мур сцямна-зялёны |
| 7) лёд чуць пасярэдзіне падняты | Ё) як вартаўнік чыёй магілы |
| 8) дым бялявы | Ж) бы тыя красачкі-дзяўчынкі |
| 9) пышныя постаці адзінокіх дрэў | З) як вартаўнікі |
| 10) дурны ў задачах | І) як найдарожшыя каменні |

**Адказы:** 1Ё, 2Д, 3Г, 4Ж, 5В, 6І, 7Е, 8А, 9З, 10Б.

**8. Пазнайце героя і твор.**

1. «Такі пісака, — // Не расчытае і сабака». *(Алесь; «Дарэктар».)*

2. «Хібіў часта: // Задач ніяк не браў». *(Уладзя; «Дарэктар».)*

3. «Пасля такога здарэння ён стаў ціхім і яшчэ больш задуменным». *(Базыль; «У старых дубах».)*

4. Двойчы неўзаметкі
Саскокваў з печы на разведкі. *(Костусь; «На рэчцы».)*

5. З вузел ростам,
У сваім уборы бедным, простым,
У зрэбных портках і кашулі. *(Дарэктар Яська Базылёў; «Дарэктар».)*

6. «З навукай хлопец штось не ладзіў...» *(Уладзя; «Дарэктар».)*

7. «Як вузел, хлопец невялічкі!» *(Яська Базылёў; «Дарэктар».)*

8. Цішком сабраўся, апрануўся
Ды ў лес з сякеркаю кульнуўся. *(Костусь, «На рэчцы».)*

9. «Без усякай злой мыслі раптам вылецеў з-за куста і гукнуў на ўсю моц». *(Грышка, «У старых дубах».)*

10. Стаў вылічаць расходы, страту
І кончыў тым: лепш к сабе ў хату
Наняць дарэктара на зіму. *(Міхал, «Дарэктар».)*

**9. Гульня «Чый голас?».** Адгадайце, хто сказаў наступныя словы.

1. «Ён стаў бы багатым на зайздрасць чужынцам». *(Маці-гара.)*

2. «Да цябе прыйшлі дарагія госці, толькі яны баяцца зірнуць табе ў вочы». *(Жаваранак.)*

3. «Засні, сагрэйся, мой пахілы, // Пакуль табе прыбудуць сілы». *(Мароз.)*

4. «Пагнуў вас снег, мае хваінкі. // Эх вы, гаротныя націнкі!» *(Костусь.)*

5. «Пара б і нашым за навуку». *(Міхась.)*

6. «Калі што й ведаў, то забыўся, // Бо ўжо даўно пісаць вучыўся». *(Алесь.)*

7. «Ты думаеш, ім не хочацца пагуляць? Цяпер іх час, і гуляюць». *(Базыль.)*

8. «Ці ёсць на свеце такі чалавек, які б панёс гэты дуб?» *(Грышка.)*

9. «Мне і самой хацелася паглядзець на другія краіны белага свету». *(Крынічка.)*

10. «Склады чытаць ты пойдзеш скора, // Абы каб літары нам знаць». *(Яська Базылёў.)*

**10. Знайдзіце пару.**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Базыль | Крынічка | Костусь | Грышка | жаваранак |
| лес | Рэчка | Уладзя | маці-гара | Алесь |

**Адказы:** Базыль — Грышка; Крынічка — маці-гара; Рэчка — Костусь; Лес — жаваранак; Уладзя — Алесь.

## VI клас

У VI класе вывучаюцца два творы Якуба Коласа — казка «Жывая вада» і байка «Конь і сабака».

**1. Разгадайце наступныя рэбусы.**

1. КЛ = КВ



*(Кветка.)*

2. Р = С



\+ К

*(Пясок.)*

3. Б = Й



*(Край.)*

4.



,, + Ь

*(Конь.)*

5. М = ХВ



*(Хвост.)*

6.




7.



2313 *(Вада.)*

321УМ *(Розум.)*

**2. Разгадайце крыжаванку.**




1. З гары сыпаўся жоўты... і засцілаў ураджайны грунт.
2. Свабодны ... гуляў на волі.
3. Пакінула шчасце і той слаўны ...
4. Хутка, як ..., вырастала гара.
5. Толькі ... кружыліся ў небе.
6. І мала калі падаў ...
7. Жыццё, затрыманае праз доўгі час гарою, ізноў пайшло сваёю дарогаю, і ажыло Мёртвае ...
8. ... усё расла.
9. Не ў сілах было само неба стрымаць тыя...

**Адказы:** 1 — пясок; 2 — конь; 3 — куточак; 4 — грыб; 5 — каршуны; 6 — дождж; 7 — Поле; 8 — гара; 9 — слёзы.

**3. Злучыце «прыметнік + назоўнік».**

| | |
|---|---|
| 1) чорная | А) лес |
| 2) урадлівая | Б) злосць |
| 3) стары | В) смерць |
| 4) вольны | Г) край |
| 5) глухая | Д) хмара |
| 6) марудная | Е) свет |
| 7) багаты | Ё) зямля |

**Адказы:** 1Д, 2Ё, 3А, 4Е, 5Б, 6В, 7Г.

**4. Па малюнку назавіце твор, з якога ўзяты вобраз.**

1.



Цюцька *(«Конь і сабака».)*

2.



Мёртвае Поле *(«Жывая вада».)*

3.



Конь *(«Конь і сабака».)*

4.



Жывая вада *(«Жывая вада».)*

**5. Расшыфроўшчыкі.** З дапамогай лікаў зашыфраваны сказ з байкі «Конь і сабака». Лікі адпавядаюць парадкаваму нумару літар у беларускім алфавіце, г. зн. кожны лік — гэта пэўная літара (ДЖ, ДЗ асобнымі літарамі не лічацца).

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 18 | 21 | 5 | 9 | 29 | 12 | 1 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5 | 21 | 8 | 27 | 28 |

| | |
|---|---|
| 9 | 1 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 12 | 1 | 15 | 32 |

**Адказ.** Рудзька дужшы за каня. («Дужшы» — аўтарскае слова, правільна — «дужэйшы».)